СССР І.Лучанок, народны артыст БССР Г.Вагнер, кампазітар Э.Тырманд, заслужаны настаўнік БССР Л.Ліхачэўская, прафесар Беларускай акадэміі музыкі В.Рахленка, заслужаная артыстка БССР Л.Максімава і інш. Г.Шаршэўскі выхаваў цэлую плеяду паслядоўнікаў, якія працягваюць яго справу выхавання новага пакалення піяністаў. Педагагічная дзейнасць Г.Шаршэўскага праходзіла ў непарыўнай сувязі з выканальніцкай. Ён актыўна канцэртаваў у якасці саліста і члена ансамбля, удзельнічаў у канцэртах на франтах Вялікай Айчыннай вайны, атрымаў званне заслужанага дзеяча мастацтваў БССР.

Вялікая любоў педагогаў да сваёй прафесіі, іх уласная канцэртная дзейнасць мелі вялікае значэнне ў фарміраванні беларускай фартэпіяннай культуры. Гэта яны, выхаванцы рускай піяністычнай школы, вучні В.Сафонава, С.Саўшынскага, К.Ігумнава, А.Есіпавай, Г.Нейгаўза, Ул.Сафраніцкага, сталі заснавальнікамі нацыянальнага беларускага фартэпіяннага выканання.

**І.Б.Тарасава,**
*суіскальнік кафедры бібліятэказнаўства*

## РОЛЯ БІБЛІЯТЭК Ў ВЫХАВАННІ ДЗЯЦЕЙ

З даўніх часоў бібліятэкі былі месцам інтэлектуальнага развіцця дзяцей. Нават у Старажытным Егіпце ішоў працэс навучання пісараў на базе тэкстаў, захаваных у бібліятэках. У нашай нацыянальнай культуры дзіцячыя бібліятэкі ўзніклі больш 100 гадоў таму як інстытут зносін, прызначаны клапаціцца аб асвеце і духоўным здароўі дзяцей.

Іменна кніга, чытанне іграюць галоўную ролю ў інтэлектуальным развіцці дзяцей. Па меркаванні вучоных, фарміраванне інтэлекту залежыць на 90 % ад чытання і толькі на 10 % ад іншых фактараў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзякуючы актыўнаму ўкараненню чытання можна выратаваць дзяцей ад вынікаў функцыянальнай непісьменнасці, якая вельмі распаўсюджана сярод падрастаючага пакалення такіх краін, як ЗША, Канада, Францыя, Германія і інш. Па вызначэнні ЮНЕСКА, тэрмін “функцыянальная непісьменнасць” прымяняецца да асобы, у значнай меры страціўшай навыкі чытання і пісьма і няздольнай да ўспрымання кароткага нескладанага тэксту, які мае адносіны да паўсядзённага жыцця. Функцыянальная непісьменнасць збядняе і пагаршае жыццё чалавека. Любоў да кнігі, да ведаў з дзяцінства — гэта аснова не толькі далейшай пісьменнасці, але і шчаслівая магчымасць рэалізаваць сябе.

Паколькі бібліятэка з’яўляецца дэмакратычнай установай, сюды чытач ідзе сам, па сваёй волі, адчуваючы патрэбнасць у кнізе. Зносіны з кнігай у бібліятэцы — свабодны працэс, заснаваны на добраахвотным жаданні далучыцца да духоўнага вопыту чалавецтва. У біблятэцы дзяцей чакаюць, ім заўсёды дапамогуць выбраць кнігу. Спецыфіка бібліятэкі дазваляе ўбачыць, пачуць кожнага чытача. Вельмі часта паміж бібліятэкарам і чытачом устанаўліваюцца канфідэнцыяльныя зносіны.

Бібліятэчныя работнікі ў сваёй працы шырока выкарыстоўваюць іграв<br>ыя моманты. Інтэлектуальныя гульні стымулююць пазнавальны інтарэс, працоўную актыўнасць дзяцей, дапамагаюць ім у самавыяўленні, самасцвярджэнні. Вялікую цікавасць уяўляюць творчыя гульні, такія як “Пагуляем у слова”, дзе дзеці разгадваюць галаваломкі, шарады, загадкі; гульні-гутаркі (“Чые гэта сляды?”); гульні-падарожжы (“Падарожжа Кропелькі”); пазнавальныя гульні-казкі (“Прыгоды ў лясным гушчары”), гульні-конкурсы (па казках Г.-Х.Андэрсена і інш.). Для больш дыферэнцыраванага ўздзеяння на чытача разыгрываюцца сітуацыі рознага ўзроўню складанасці, дзе чытач “ужываецца” ў прапануемы вобраз і шукае выйсце са склаўшагася становішча, выкарыстоўваюцца сюжэтна-ролевыя гульні (“Хруша захварэў”, “Школа дзелавога

малыша", "Я, дзядзька Этыкет і ўсе, усе, усе..."), а таксама міні-спектаклі (напрыклад, "Калі якое слова вымавіць"), элементы тэлевізійных гульняў "Зорная гадзіна", "Краіна Геральдыка", "Жыллё: хаціны, хаты, палацы", "Радаслоўная рэчаў", "Русь загадкавая" і інш. Гульні прыносяць дзецям радасць, і пры гэтым яны вучацца, развіваюць уяўленне, фантазію, абстрактнае мысленне, эмпатычныя здольнасці.

Для асабістага самасцвярджэння ў працэсе індывідуальнай работы дзеці выконваюць розныя варыянты творчых заданняў. Значным у інтэлектуальным і творчым развіцці дзяцей з'яўляюцца элементы акцёрскага майстэрства. Дзеці самастойна складаюць і разыгрываюць казкі на вядомыя сюжэты з новым зместам (як, дзякуючы ведам Этыкету, Чырвоная Шапачка перамагла злога воўка; як Бураціна выходзіў са складанага становішча, праяўляючы выхаванасць і такт). Шырока выкарыстоўваюцца лялечныя тэатры, дзе дзеці самі ставяць пастаноўкі па матывах казак, разыгрываюць маральна-этычныя сітуацыі ("Запрашаем у Майдадырск", "Парады доктара Градусніка", "Мудрая Сава і пан Этыкет спяшаюцца на дапамогу").

Значны ўплыў на інтэлектуальнае развіццё дзяцей могуць аказаць разам з папяровымі носьбітамі інфармацыі розныя віды дакументаў: аўдыё- і відэакасеты, дыскеты, CD-ROM, глабальныя інфармацыйныя сеткі. Мы лічым, што не трэба кнігу проціпастаўляць новым тэхналогіям.

У аснове інтэлектуальнага і творчага развіцця павінна знаходзіцца не эпізадычная сустрэча чытача і бібліятэкара, а глыбокая, добра прадуманая работа, накіраваная на сістэматычнае іх узаемадзеянне. Адзін з дзіцячых філіялаў бібліятэкі ўжо два гады працуе па праграме "Свет дзяцінства", дзе масавыя мерапрыемствы з дзецьмі праводзяцца па тэматычных блоках. Напрыклад, маецца блок для падрыхтоўкі да школы "Разам з кніжкай і цацкай", створана студыя гуманітарнага развіцця "Крынічка", дзе дашкольнікі вучацца чытаць, пісаць,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

размаўляць. Для гэтага выкарыстоўваюцца гульня, лялечны тэатр, казкі. Праграма “Шлях да слова” садзейнічае развіццю мовы.

Зыходзячы з вышэйпададзенага, лічым, што дзіцячая бібліятэка можа паспяхова развіваць інтэлектуальныя і творчыя здольнасці дзяцей. Дзверы бібліятэкі павінны быць шырока расчынены для іх, даючы магчымасць кожнаму набыць духоўныя сілы, душэўны спакой і радасць ад зносін з прыгожым.

**І.Ф.Толкач,**
*суіскальнік кафедры беларускай*
*і сусветнай мастацкай культуры*

## ТВОРЫ КАМПАЗІТАРАЎ БЕЛАРУСІ ДЛЯ НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ

У 20—30-х гг. XX ст. у Беларусі зарадзілася новая галіна кампазітарскай творчасці — музыка для асобных народных інструментаў, ансамбляў і аркестраў. Падставай для яе ўзнікнення было паяўленне ў рэспубліцы музыкантаў-салістаў – выканаўцаў на народных інструментах і прафесійных выканаўчых калектываў. Першыя творы для іх былі напісаны не прафесійнымі кампазітарамі, а самімі выканаўцамі. Да такіх твораў можна аднесці апрацоўкі Д.Захара для беларускага аркестра народных інструментаў, сюіту Г.Самохіна для секстэта домраў, апрацоўкі І.Жыновіча для цымбалаў, творы Жыновіча—Вальтэра для цымбалаў з фартэпіяна.

У пачатку 30-х гг. з’явіліся творы прафесійных кампазітараў для цымбалаў (“Сюіта» Р.Пуксга, «Мазурка» Н.Сакалоўскага, «Ой, ды ў нашым сяле» А.Туранкова, «Ой, у лузе, лузе» Я.Цікоцкага) і творы для беларускага аркестра народных інструментаў («Ронда» М.Аладава, «Менуэт» І.Любана, «Беларуская сюіта» А.Туранкова, сюіта «На кірмашы» С.Палонскага).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ